3. *Косаченко, Е. Ю.* Социально-культурные условия формирования патриотического самосознания молодежи / Е. Ю. Косаченко // Культура и образование. – 2019. – № 2 (33). – С. 148–155.

4. Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 27.02.2024.

5. Социокультурные условия либерализации воспитания [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://studfile.net/preview/2978418/page:11/. – Дата доступа: 27.02.2024.

6. *Шарапова, Н. С.* Социально-культурные условия формирования гуманистических ценностных ориентаций у молодежи средствами игровых технологий : автореф. дис. ... канд. пед. наук : 13.00.05 / Н. С. Шарапова ; Тамб. гос. ун-т им. Г. Р. Державина. – Тамбов, 2015. – 24 с.

**Г. А. Машнюк,** *саіскальнік вучонай ступені кандыдата навук установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **Л. У. Ландзіна,** *доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў ПРАЦЫ ДЗІЦЯЧЫХ МУЗЕЯЎ НА МЯЖЫ XX–XXI стст.

Глабальныя падзеі напрыканцы XX ст. (распад Савецкага Саюза, уключэнне былых савецкіх рэспублік у сусветныя працэсы глабалізацыі) моцна паўплывалі на працу музеяў як культурных інстытутаў грамадства. Маштабныя змены ў музейнай справе мелі як пазітыўны, так і негатыўны характар. Канец XX – пачатак XXI ст. абумоўлены ўздымам у развіцці музеязнаўства на постсавецкай прасторы: пашыраліся навуковыя кантакты з заходнімі калегамі, уваходзілі ў зварот працы навукоўцаў пачатку XX ст. Пачалі стварацца асобныя дзіцячыя музейныя цэнтры пры вялікіх музеях, і як вынік – узнікненне самастойных дзіцячых музеяў [8, с. 64].

Пасля распаду СССР краіны былі ўключаны ў глабальныя эканамічныя, палітычныя і культурныя інтэграцыйныя працэсы. На развіццё музейнай справы моцна ўплывала змена гіста-

рычнай палітыкі ў былых постсавецкіх краінах. Адбывалася рэфлексія над савецкім мінулым, пераглядалася гістарычная палітыка, у тым ліку і нацыянальных гістарыяграфічных школ. Праявай пераарыентацыі гістарычнай палітыкі стала стварэнне музеяў, прысвечаных былым спецслужбам. У большасці выпадкаў канцэптуальна ў падобных музейных установах паказваліся негатыўныя працэсы, якія адбываліся падчас савецкай улады, як напрыклад, у краінах Балтыі [6, с. 1070–1071].

Працэс глабалізацыі меў, з аднаго боку, шэраг негатыўных праяўленняў, адным з якіх з’яўляецца вестэрнізацыя культуры, г. зн. змена традыцыйных культурных парадыгм, сфарміраваных у пэўных народаў на працягу гісторыі. Прыкладам гэтага можна назваць пашырэнне масавай заходняй (амерыканскай) поп-культуры: фільмаў, музыкі, кніг, відэагульняў, якія пачалі ўваходзіць у паўсядзённае жыццё грамадства. Асабліва з лёгкасцю падобныя культурныя змены падхоплівае моладзь. Знаёмства з замежным культурным кантэнтам адбывалася ў большасці выпадкаў сярод падлеткаў і моладзі [1, с. 19; 7, с. 253].

З іншага боку, у працэсе глабалізацыі адбываліся і пазітыўныя працэсы. Адным са здабыткаў глабалізацыі з’яўляецца лічбавізацыя [1, с. 20]. Дадзены працэс не абышоў музейную справу. Акрамя новай формы камунікацыі з наведвальнікамі праз Інтэрнэт, лічбавізацыя адкрыла магчымасці для захавання, назапашвання і папулярызацыі традыцыйнай культуры. Так, многія музеі пачалі алічбоўваць музейныя калекцыі і публікаваць на інтэрнэт-старонках, што дазволіла карыстальнікам знаёміцца з музейнымі калекцыямі незалежна ад месца знаходжання музеяў. Падобная палітыка дала вынікі ў перыяд пандэміі COVID-19, калі праз каранцінныя абмежаванні пляцоўкай для камунікацыі сталі выступаць інтэрнэт-сайты музеяў. Дзіцячы музей – філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ) – таксама выкарыстаў такую магчымасць і публікаваў на сайце ў рубрыцы «Гульнявая старонка» анлайн-заняткі, якія непасрэдна тычыліся экспазіцыі і тэматыкі экспазіцыйных комплексаў музея.

У канцы 1990-х – пачатку 2000-х гг. адбылося адраджэнне канцэпцыі патрыятычнага выхавання моладзі. Не апошнюю ролю ў аднаўленні сыгралі дзяржаўныя кіруючыя структуры. У 2006 г. была прынята «Канцэпцыя бесперапыннага выхавання

дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь», у 2015 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь – «Канцэпцыя бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі», у 2021 г. – «Праграма бесперапыннага выхавання», у 2023 г. выдадзена пастанова Савета Міністраў «Аб канцэпцыі развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024–2026 гг.».

Сёння розныя ўстановы адукацыі і культуры супрацоўнічаюць, ствараючы спецыяльныя праграмы па патрыятычным выхаванні дзяцей, пачынаючы з дашкольнага ўзросту. Напрыклад, праца з дзіцячай аўдыторыяй (дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту) адбываецца ў кантэксце знаёмства з гісторыяй малой радзімы ці горада праз розныя культурна-адукацыйная практыкі: пешаходныя экскурсіі, наведванне музеяў, працу школьных музеяў ці міні-музеяў пры дашкольных установах [12, с. 67–68; 13, с. 36].

Як адзначае А. Я. Жыткоў, калі не займацца з моладдзю, а асабліва з дзецьмі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту патрыятычным выхаваннем, у першую чаргу праз вывучэнне лакальнай гісторыі, як, напрыклад, праз вывучэнне гісторыі роднага горада, то ўвогуле для маладога пакалення становіцца бессэнсоўнай гісторыя як свайго краю, так і да нацыянальнай узнікае абыякавасць, што разбурае нацыянальную самасвядомасць [4, с. 28–29]. У гэтым плане маладое пакаленне як Tabula rasa («чыстая дошка»), на якую можна «напісаць» новыя, нехарактэрныя культурныя коды ці практыкі, нават дэструктыўнага характару. Таму праца па патрыятычным выхаванні асабліва актуальная [5, с. 193].

Як адзначана вышэй, адным з напрамкаў працы музеяў, у тым ліку і дзіцячых, з’яўляецца праектная дзейнасць і супрацоўніцтва з іншымі інстытутамі. У сваю чаргу, Дзіцячы музей (філіял НПГКМЗ) працуе з дашкольнымі ўстановамі горада Полацка. Так, у праекце «Каб памяталі…» на базе полацкага дзіцячага сада № 29 напярэдадні Дня Перамогі супрацоўнікамі Дзіцячага музея праводзяцца музейна-педагагічныя заняткі сярод выхаванцаў старэйшага дашкольнага ўзросту з выкарыстаннем як прадметаў з музейнага збору НПГКМЗ, так і з дапамогай мультымедыйнай тэхнікі [11]. У 2022 г. на базе Дзіцячага музея працавала часовая выстава «Дзеці вайны», на аснове экспазіцыі якой праходзілі музейна-педагагічныя заняткі. На-

ведвальнікі знаёміліся з лакальнай гісторыяй перыяду Вялікай Айчыннай вайны, прысвечанай дзецям Полаччыны, разглядаліся розныя аспекты: эвакуацыя больш за сотні маленькіх выхаванцаў Дзіцячага дома імя К. М. Самойлавай пад кіраўніцтвам загадчыцы П. С. Партновай, перыяд акупацыі дзіцячага дома ў в. Быкаўшчына Полацкага раёна, аперацыя «Зорачка» па эвакуацыі дзяцей з в. Бельчыца ў красавіку 1944 г. падчас карнай аперацыі нацыстаў «Зімовае чараўніцтва» па ліквідацыі Полацкай партызанскай зоны [3].

У 2022 г. у Дзень народнага адзінства была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, прысвечаная П. С. Партновай, на будынку ясляў-сада № 24 у Полацку (якому было прысвоена імя загадчыцы). У дзіцячым садзе працавала часовая выстава, прысвечаная эвакуацыі дзяцей дома-дзіцяці імя К. М. Самойлавай у чэрвені 1941 г. з Полацка ў Чувашскую АССР [2; 9, с. 154].

Такім чынам, сацыякультурныя падзеі, якія адбыліся на мяжы XX і XXI стст. для музейнай супольнасці, у тым ліку і для дзіцячых музеяў, мелі як пазітыўныя, так часам і негатыўныя праявы. Змена гістарычнай палітыкі ў канцы XX ст. абумовіла змяненні ў сферы культуры, што адбілася на музеі як сацыяльна-культурным інстытуце і інстытуце памяці. Адным з механізмаў адаптацыі да новых абставін стала палітыка супрацоўніцтва з іншымі сацыяльнымі інстытутамі і супольнасцямі, якая праяўляецца ў актывізацыі працы па патрыятычным выхаванні моладзі, падтрыманай на дзяржаўным узроўні. Патрыятычнае выхаванне стала міжінстытуцыянальнай сферай дзейнасці музеяў і ўстаноў адукацыі і культуры, што дапамагае ахапіць больш вялікае кола як асноўнай, так і патэнцыяльнай аўдыторыі. Патрыятычнае выхаванне спрыяе фарміраванню ў будучых пакаленняў гістарычнай памяці, уяўлення аб сваім месцы ў гісторыі і закладвае падмурак нацыянальнай ідэнтычнасці ў працэсе сацыялізацыі і фарміравання асобы ў дзяцей і моладзі. У гэтым кірунку дзіцячыя музеі як установы культуры займаюць адну з ключавых пазіцый.

1. *Боровикова, В. О.* Информационно-технологическое будущее социального благополучия в 21-м веке / В. О. Боровикова ; науч. рук. С. А. Жиронкин // Непрерывное благополучие в мире : сб. науч. трудов Междунар. науч. симпозиума, Томск, 11–16 сент. 2016 г. – Томск, 2016. – С. 19–23.

*2.* В сердцах полочан – память о подвиге в годы Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] / Детский музей : официальный сайт. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/64126. – Дата доступа: 31.01.2024.

*3.* Выставка «Военное детство» [Электронный ресурс] / Детский музей: официальный сайт. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/61754. – Дата доступа: 31.01.2024.

*4. Житков, А. Е.* Детям о городе: формирование исторической памяти младших школьников / А. Е. Житков // Детство как антропологический, культурологический, психолого-педагогический феномен : материалы VII Междунар. науч. конф. : в рамках проекта «А.З.Б.У.К.А. детства», Самара, 24 дек. 2021 г. – Самара, 2022. – С. 27–34.

*5. Ибетова, И. Р.* Гражданско-патриотическое воспитание обучающихся средствами музейной педагогики / И. Р. Ибетова, Н. Н. Калацкая // Психология и педагогика XXI века: актуальные вопросы, достижения и инновации : сб. материалов IV Всерос. студ. науч.-практ. конф. с международным участием, Орехово-Зуево, 16 марта 2023 г. / отв. ред. И. А. Ахметшина. – Орехово-Зуево, 2023. – С. 192–195.

*6. Кантор, Ю.* Девиации исторической политики в Восточной Европе и на постсоветском пространстве / Ю. Кантор // Quaestio Rossica. – 2021. – Т. 9, № 3. – С. 1064–1079.

*7. Костенко, В. В.* Социокультурные изменения в процессе глобализации, их воздействие на молодежь и деятельность молодежных организаций / В. В. Костенко // Социологический альманах : материалы XIII Орлов. социологич. чтений, Орёл, 3 дек. 2020 г. / сост. Е. К. Кондратова ; под общ. ред. П. А. Меркулова, А. А. Алексеенок. – Орёл, 2021. – Вып. 14: Трансформация социальной структуры современного общества: состояние, динамика, тенденции. – С. 252–257.

*8. Почобут, Н. А.* Формирование общего образовательного пространства музея и школы в конце 1990-х – начале 2000-х гг. / Н. А. Почобут // Искусство и культура. – 2022. – № 2 (46). – С. 63–69.

*9. Смирнова, Т. Р.* Образовательные проекты как одна из форм социального партнерства в вопросах нравственно-патриотического воспитания детей дошкольного возраста (из практики работы Детского музея) / Т. Р. Смирнова // Музей. Спадчына. Памяць : зб. дакладаў дзелавой праграмы V Нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі», Мінск, снеж. 2022 г. / рэд. С. А. Байкоў. – Минск, 2023. – С. 148–157.

*10. Солодухин, В. И.* Проблемы этнокультурного развития молодежи в условиях глобализации и цифровизации / В. И. Солодухин // Актуальные проблемы развития экономики, прикладной информатики, конфликтологии, рекламы и социально-культурных технологий в цифровую эпоху : сб. науч. докладов Региональной науч.-практ. конф., Москва, 8 апр. 2020 г. – М., 2020. – С. 193–199.

*11.* Сохраняем память о подвигах наших дедов! [Электронный ресурс] / Детский музей : официальный сайт. – Режим доступа: http://children.polotsk.museum.by/node/55441. – Дата доступа: 31.01.2024.

*12. Шевцова, С. Н.* Современная работа школьных библиотек и школьных музеев по патриотическому воспитанию обучающихся / С. Н. Шевцова, О. А. Шевцова // Педагогический опыт: от теории к практике : материалы Всерос. науч.-практ. конф., Чебоксары, 12 апр. 2023 г. / гл. ред. О. Н. Широков. – Чебоксары, 2023. – С. 67–69.

*13. Шиптенко, Ю. М.* Внедрение модели нравственно-патриотического воспитания детей старшего дошкольного возраста посредством приобщения к истории и культуре / Ю. М. Шиптенко // XXIV Вишняковские чтения «Вузовская наука: условия эффективности социально-экономического и культурного развития региона» : материалы Междунар. науч. конф., Бокситогорск, 16 апр. 2021 г. / отв. ред. Е. Г. Седлецкая. – СПб. ; Бокситогорск, 2021. – С. 35–39.

**В. В. Нестерова,** *соискатель ученой степени кандидата наук учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств».*
Научный руководитель – **Н. В. Карчевская,** *кандидат искусствоведения, доцент, ректор учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

# ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ ХОРЕОГРАФИИ В СОВРЕМЕННОМ ЦИРКОВОМ ПРЕДСТАВЛЕНИИ

Отличительной особенностью современных тенденций развития хореографии и цирка стало многообразие взаимодействия форм данных видов искусства, их взаимное обогащение творческими методами и способами отражения мира. Сотрудничество цирка и хореографии сегодня стало более тесным. Цирк и танец – искусство коллективное. Цирковой номер, представленный на манеже, зритель воспринимает комплексно, что усиливает художественную и эмоциональную выразительность происходящего на арене или манеже. Впечатление зрителя от увиденного формируется не от одного артиста, а от творческого коллектива. Ценность циркового искусства обусловлена единством психофизических данных выступаю-